Падтрымай "Вясну" на PATREON

Год калоніі строгага рэжыму – за словы "Лукашенко – петух"

04.08.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск, дыфамацыя

3 жніўня суд Савецкага раёна горада Мінска разгледзеў справу 42-гадовага Аляксея Шчарбацюка. Суддзя Фёдарава прызнала яго вінаватым у здзяйсненні злачынства, прадугледжанага ч.1 арт. 368 КК і асудзіла да года пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму. Бок дзяржабвінавачання падтрымаў пракурор Чабатароў. Шчарбацюк узяты пад варту ў залі суда.

Яго абвінавацілі ў тым, што 15 траўня 2021 года, знаходзячыся на балконе кватэры, будучы ў нецвярозым стане, крычаў **"Жыве Беларусь!"** і "Лукашенко – петух!" Абвінавачванне сцвярджае, што ён крычаў наўмысна гучна, каб яго крыкі чулі іншыя. Тым самым ён абразіў Лукашэнку.

Абвінавачаны прызнаў віну. Памятае, што крычаў "Жыве Беларусь!", а таксама не адмаўляе, што мог выкрыкваць абразу, але не памятае, што менавіта крычаў у той раз. Ён патлумачыў, што крычаў пра Лукашэнку, маючы на ўвазе, што ён – агрэсіўна настроены чалавек, паколькі бачыў, як той бегаў з аўтаматам са сваім сынам і крычаў: "Што, пацукі, разышліся ўжо?" Шчарбацюк таксама адзначыў, што яму ўсё адно, хто знаходзіцца ва ўладзе – *«Лукашэнка, Ціханоўскі ці Леанід Ільіч Брэжнеў!»* Да Лукашэнкі ён не мае негатыўнага стаўлення. Шчарбацюк адзначыў: *"Калі б я меў на ўвазе пасіўны гомасэксуалізм, я б крыкнуў іншае слова на літару "п", а не "певень"*.

Суддзя Фёдарава зачытала яго пісьмовыя паказанні падчас следства, так як выявіліся істотныя супярэчнасці. У пісьмовых паказаннях абвінавачаны сцвярджаў, што ў яго *"з'явіўся намер абразіць прэзідэнта, усведамляў, што абражаю, усведамляў, што гэта чуюць людзі, ведаў, што пазначае гэтае слова ў крымінальных колах"*. Гэта значыць, Аляксей двойчы абразіў Лукашэнку: з балкона і каля пад'езда. На судзе ён патлумачыў, што даваў такія паказанні, каб яго адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе.

Сведка **Сяргей Сапега** ў той дзень піў з абвінавачаным піва: на судзе ён сказаў, што не памятае, што менавіта крычаў Шчарбацюк, але ў пісьмовых паказаннях усё пацвердзіў. Сведкі **Вольга Майская** і **Мікіта Яўсеенка** (студэнт трэцяга курсу Акадэміі МУС) распавялі, што ў той дзень праходзілі міма дома і пачулі, як незнаёмы чалавек абражае Лукашэнку. Яны патэлефанавалі ў 102, каля іншага дома пачакалі, пакуль прыедзе міліцыя, бачылі, як Шчарбацюк з сябрам крычалі каля пад'езда лозунгі і паказвалі праходзячай групе моладзі два пальцы.

Падчас ператрусу ў кватэры Аляксея Шчарбацюка нічога не было выяўлена. У заключэнні медыцынскага эксперта – даведка аб тым, што абвінавачваны хворы на псіхічныя захворванні, хранічны алкагалізм, неаднаразова судзімы.

У апошнім слове Аляксей Щербатюк прасіў аб літасці.

Пракурор папрасіў пакараць абвінавачанага **годам пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму**. Менавіта такое пакаранне вынес суддзя.

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY